**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь**
**народны тэатр танца «Алексіс»**
**Палаца культуры ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод»**

Тэатр танца «Алексіс» пачаў сваю творчую дзейнасць у 1999 годзе. Яго заснавальнікам і мастацкім кіраўніком з'яўляецца Зенчанка Аляксандр Сяргеевіч, выпускнік Мінскага каледжа мастацтваў.

На сённяшні дзень у калектыве займаюцца 40 чалавек ва ўзросце ад 6 да 33 год. Удзельнікі падзелены на дзве групы: асноўную і падрыхтоўчую.

Асноўным накірункам творчай дзейнасці калектыву з'яўляецца сучасны танец, дыска, джаз, сучасная пластыка і іншыя. Новыя віды харэаграфіі выклікаюць вялікую цікавасць сярод моладзі горада. Таму колькасць удзельнікаў, выканаўчы ўзровень, майстэрства ўзрастае з кожным годам.

Для танцораў калектыву характэрны добрая харэаграфічная падрыхтоўка, высокая выканаўчая культура, артыстызм. У тэатры танца «Алексіс» вядзецца работа па выхаванню ў яго ўдзельнікаў харэаграфічнага і музычнага росту: танцоры ў абавязковым парадку наведваюць канцэрты і праглядаюць відэазапісы выступленняў розных танцавальных калектываў. «Алексіс» адрозніваецца прадуманасцю выбару музычнага матэрыялу, пошукам уласнага харэаграфічнага стылю, разнастайнасцю рэпертуару.

Калектыў прымае актыўны ўдзел у гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях. У 2007 г., 2011 г. калектыў быў удастоены заахвочвальнай прэміі спецыяльныга фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Калектыў прымае ўдзел у дабрачынных акцыях для дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, у міжнароднай дабрачыннай акцыі для дзяцей-сірот і дзяцей-інвалідаў «Адчыні сваё сэрца».

Мэта калектыву – папулярызацыя і развіццё сучаснага харэаграфічнага мастацтва, далучэнне да новых накірункаў харэаграфіі таленавітай моладзі і падлеткаў, іх падтрымка, стымуляванне творчага росту і культурнага ўзроўню ўдзельнікаў тэатра танца.







